Цана 1.500 мк.

НАШАЕ НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ

АДНАДНЁЎКА

Пятніца 6-га Ліпеня 1923 г.

Горкія плады.

У палітыцы самае страшнае тое, што кожная абмылка, кожын фальшывы крок раней, ці пазьней, але заўсёды імсьціцца на тым, хто іх зрабіў. Дый горш таго: за абмылкі таго або іншага палітыка расплачывацца прыходзіцца найчасьцей не вінавайцу, а ўсей дзяржаве, усяму народу.

Палітыка кіраўнікоў польскага дзяржаўнага карабля была ў адносінах да няпольскіх нацыянальнацей палітыкай „пекных слоў“ і „дужа няпекных учынкаў“. Грашыў гэтым перад усім пан Язэп Пілсудскі, грашылі і ўсе зьмяніўшыя адзін аднаго ўрады, а ў тым ліку і мо' найбольш грашылі так-званыя „левыя“ міністэрствы, якія **баяліся** даваць волю „інародцам“, усьцяж аглядаючыся на „правіцу“: ці не скарыстае яна з лішняга лібэралізму“ габінэту, каб за гэта скінуць міністэрства? І ўсе гэтыя габінэты былі „левымі“ адно толькі да таго мамэнту, у якім пачыналася колізія паміж дамаганьнямі „інародцаў“ і эндэцкай ідэалёгіяй. Яны аказваліся няздольнымі нават на тое, каб прывясьці ў жыцьцё прынцыпы польскае конституцыі, на паперы вельмі паступовыя і лібэральныя адносна да ўсіх нацыянальнасьцей.

„Хто рэжа, таму не баліць; баліць таму, каго рэжуць“. Зусім зразумела, што пакрыўджаныя нацыянальнасьці не маўчалі, а дзе і як маглі дапаміналіся сваіх законных правоў. А ўсе выступленьні нацыянальных меншасьцей Польшчы усе іх пратэсты скваапна падхопліваліся ворагамі Польскае Рэспублікі, якія лоўка іх выкарыстывалі дзеля барацьбы з Польшчай.

У перадапошнім нумары „Нашага Сьцягу“ была надрукована заява ў прускім сойме прускага прэм'ера Браўна, які сказаў, што Польшча сваімі адносінамі да нацыянальных меншасьцей сама сябе пазбавіла права жаліцца на уціск палякоў у Нямеччыне. У адказ на гэтыя словы польскае міністэрства заграгнічных спраў загадала свайму прадстаўніку ў Бэрліне падаць нямецкаму ураду пратэст проці такога закіду і заявіць, што польскі ўрад у адносінах да меншасьцей кіруецца прынцыпамі найдасканальшае роўнасьці і справедлівасьці... Ды не засохла пэўне чарніла на польскай ноце, як з падобнымі закідамі выступіла чэская поўурадовая газэта „Czeske Slowo“. Яна рэзка адказвае на нарэканьні палякоў на чэскую палітыку адносна да польскае меншасьці ў Чэха-Славакіі, радзючы польскаму ўраду перш даць сваім меншасьцям тыя правы, якія чэхі даюць нацыяльным меншасьцям у Чэхіі, а тады ўжо крытыкаваць палітыку чэскага ўраду.

Польская ўрадовая прэса дае чэскай газэце вострую адправу. Але аднымі славамі тут нічога не даб'ешся. І кіраўнікі польскае дзяржаўнае палітыкі павінны паруп іцца не аб тое, каб чэскі ці нямецкі ўрады **забаранялі** рабіць падобныя закіды Польшчы, а аб тое, каб ня даць сваім ворагам **магчымасьці** дзеля гэткіх выступленьняў.

Ведама, эндэцыя ацэнівае палажэньне з таго пагляду, што раз з прычыны „інародцаў“ робяцца прыкрасьці Польскай Рэспубліцы, дык трэба на гэных „прэступніках“ памсьціцца: самы крык таго, каму блага і цяжка, яны лічаць ужо за праступленьне.

Не, Панове! такімі спосабамі вы не здалееце зьмяніць заграніцай пагляд аў на вашу палітыку. Толькі радыкальны паварот у польскай нацыянальнай палітыцы ў кірунку да запраўднага зьдзейсьненьня прынцыпаў справядлівасьці і роўнасьці ўсіх нацыянальных меншасьцей—і то не адкладываючы ні на адзін мамэнт—можа даць вам выхад з палажэньня, у якое паставілі Польшчу абмылкі кіраўнікоў польскае палітыкі.

Другой дарогі няма.

Лаўрыновіч.

Палітычныя падзеі.

Польшча. У жалезна-дарожных дырэкцыях Станіслаўскай, Львоўскай і Кракоўскай распачалася забастоўка. Забастоўка ня толькі не слабее, але пашыраецца: далучаюцца новыя станцыі і новыя катэгорыі рабочых. Беспасрэднай прычынай забастоўкі зьяўляецца пастанова Рады Міністраў, прызнаючая дзяржаўным служачым толькі 28 прац. дадатку на дарагоўлю ў той час, калі цэны на прадукты першай патрэбы падскочылі на 100 прац., а часам і больш. Учасьце ў забастоўцы бяруць усе жал.-дар. арганізацыі бяз розьніцы палітычных пaглядаў.

Англія. На канфэрэнцыі работніцкай партыі прынята рэзалюцыя Макданальда, якая пратэстуе проціў акупацыі Рурскага Басэйну і адначасна дамагаецца перагавораў аб прызнаньні савецкага ўраду. Аднагалосна прынята рэзолюцыя, прызываючая паслоў ад работніцкай партыі, каб спрацiўляліся павялічэньню ангельскага паветранага флёту.

Францыя. Старшыня францускай гандлёвай дэлегацыі, Дювэржэ, перад выездам да Парыжу заявіў прадстаўніком прэсы, што вязе ў Францыю шмат праектаў дагавораў у справе вывазу збожа і дрэва з Расеі ў Францыю. Дювэржэ спадзеецца, што гэтыя праекты будуць аргумэнтам, які пераканае францускі ўрад і заставіць яго навязаць гаспадарчыя зносіны з Сав. Рэспублікамі, а пасьля і палітычныя. Дювэржэ пераконаны, што здолае ўгаварыць францускі ўрад да прызнаньня савецкага ўраду de facto і высылкі ў Маскву афіцыяльнага гандлёвага прадстаўніка.

Сэнат ухваліў крэдыты на акупацыю Рурскага басэйну.

У часе дыскусыі над бюджэтам у палаце дэпутатаў камуніст Вэртон зажадаў прызнаньне праз Францыю савецкага ўраду. Пуанкарэ адказаў, што савецкі ўрад павінен, калі не заплаціць, дык хаця-б прызнаць доўг бышай Расеі Францыі.

Югаславія. Падчас, калі старшыня міністраў Польшчы выхадзіў са Скупшчыны адзін сэрб Мілан Райц выстраліў у яго чатыры разы з рэвальвэру. Пашыч лёгка ранены куляю ў плячо і асколкамі шкла з разьбітай шыбы аўтамабіля. Матывы замаху палітычныя.

Газэты паведамляюць, што ў угодкі анэксыі Чарнагорыі праз Югаславію—там пачалося паўстаньне. Падпалена шмат касьцёлаў і забіта некулькі ксяндзоў. Шмат асоб арыштавана.

Амэрыка. Прэзыдэнт Гардынг у прамове аб ваенных даўгох заявіў, што скасаваньне іх пашкодзіла-б гандлёвым адносінам. Такім чынам яшчэ раз Злучаныя Штаты падкрэсьлілі, што даравaць свае даўгі Эўропэйскім дзяржавам, без чаго апошнім трудна паправіць свае грашавыя справы, — яны зусім ня зьбіраюцца.

Баўгарыя. Газэты паведамляюць, што баўгарскія нерэгулярныя аддзелы перайшлі грэцкую граніцу і напалі на грэцкія пагранічныя аддзелы. Прадстаўнік грэцкага ўраду злажыў пратэст, дамагаючыся даць у працягу пяці дзён задаваленьне, пагражаючы разрывам дыплёматычных зносінаў.

Нямеччына. Нямецкая марка падае ўсё болей. Загады ўраду, скіраваныя да таго, каб устрымаць спадак маркі, не даюць ніякіх вынікаў.

Літва. З ініцыятывы прэзыдэнта адбылася нарада лідэраў соймавых фракцый у справе ўтварэньня новага кабінэту, але з прычыны становішча найбольшай фракцыі—хрысьціян-дэмакратаў да згоды не дайшло.

Сьмерць Клары Цэткін.

Памёрла вядомая камуністка Клара Цэткін, якая брала ўчасьце ў нарадах міжнароднай камуністычнай экзэкутывы ў Маскве.

Звальненьне Патрыарха Ціхана.

„Известия“ друкуюць гэткае афіцыяльнае паведамленьне:

„16 чэрвеня патрыарх Ціхан зьвярнуўся да найвысшага суду з гэткай заявай:

„Будучы ўзгадованым ў манархічных колах і знаходзячыся да майго арышту пад уплывам асоб, якія былі настроены проціў савецтаў, таксама быў настроены проціў савецкай улады, пры гэтым з пасыўнага становішча часамі пераходзіў да актыўнай дзейнасьці, як напр., калі пасьля Берасьцейскага міру ў 1917 г. выпісьціў адозву да насяленьня і калі ў 1922 г. заклікаў людзей да спраціву канфіскаце царкоўных каштоўнасьцей. Усе мае антысавецкія чыны пералічаны з дробнымі недакладнасьцямі ў акце абвінавачэньня найвышэйшага суду.

Прызнаючы слушнасьць судовай пастановы, каб пацягнуць мяне да адказнасьці, згодна з паказанымі ў акце абвінавачэньня параграфамі карнага кодэксу за антысавецкую дзейнасьць, цяпер выказую жаль з прычыны маей дзейнасьці, скіраванай проціў гаспадарсьцьвеннаму ладу, істнуючаму ў Расеі і прашу найвышэйшы суд аб звальненьні мяне з вастрогу, адначасна заяўляючы суду, што з гэтага мамэнту не зьяўляюся ворагам савецкай улады і аканчальна і рашуча выракаюся як замежнай так унутранай манархічна-белагвардэйскай акцыі“. Падпісана: Патрыарх Ціхан (Васіль Белавін).

Суд у асобах старшыні Каркліна і сябраў Галкіна і Чылыцэва на паседжаньні 25 чэрвеня пастанавіў задаволіць просьбу гр. Белавіна і згодна з парагр. 161, і 242 к.к. справу умарыць, а Белавіна звольніць з вастрогу“.

Рэвалюцыйны рух у Індыі.

Актыўныя ўчасьнікі нацыянальнага руху ў Індыі аб'яжджаюць важнейшыя гарады Індыі, агітуючы на мнагалюдных мітынгах за самавызначэньне Індыі. У Каупоры арыштавана звыш 100 дэманстрантаў. У зьвязку з арыштам сэкрэтар чугуначнага саюзу Пэнджаба зьвярнуўся да віцэ-караля з тэлеграмай, гаворачы, што рабочыя Індыі ня бачаць ніякай розьніцы між бальшавіцкай прапагандай і рабочым рухам у Эўропе. Рабочыя патрабуюць права ўзяць на на сябе абарону абвінавачванага бальшавіцкага агэнта Шуаката і паўнейшай гласнасьці яго працэсу.

Ваенныя пляны Францыі.

Ваенныя пляны Францыі ўжо даўно непакоілі Нямеччыну, а таксама Савецкія Рэспублікі. У апошнія часы Францыя стала яшчэ больш спешна папаўняць свае ваенныя сілы. Свой найбольшы ўва ўсім сьвеце паветраны флёт уздумала яшчэ павялічыць тое самае задумана і з марскім флётам. Гэта ўжо не на жарт устрывожыла Англію, якая пачула сур'ёзную небясьпеку з боку Францыі. Маленькі пераліўчык, які аддзеляе Францыю ад Англіі можна у некалькі гадзін пералецець на арэапланах пры падтрымцы марскіх сіл.

Апрача таго Францыя пачала браць у свае войска дзесяткамі тысячоў чорнаскурых афрыканцаў. На выпадак вайны, гэтыя афрыканцы могуць павялічаць францускую армію на цэлыя мільёны.

Усё гэта дае повад думаць, што Францыя мае намер панаваць у Эўропе,

ПРАЦЭС БЕЛАРУСАЎ у БЕЛАСТОКУ

Врубр. Прашу дазволу прыпомніць суду, што на зьездзе былі ня толькі Баран і Маслоўская, але і Тарашкевіч, які быў у той час адным з вышэйшых урадаўцаў ураду ген. Жэлігоўскага. На тым самым зьездзе быў вядомы Аляксюк, які, як усім ведама, прыслугоўваў польскаму ўраду; быў таксама і вядомы прыхільнік Польшчы Дубяйкоўскі.

Ня мыслю, каб урад Ластоўскага склікаючы антыпольскі рэвалюцыйны зьезд, які меў заданьне прыгатаваць аружнае паўстаньне на польскай Беларусі, запрасіў на зьезд п. п. Аляксюка і Дубяйкоўскага, з якіх першы прымаў нават учасьце ў працах палітычнай сэкцыі, што прыгатавала вядомыя рэзалюцыі.

Можа сьведка ня будзе сумлевацца ў гэтым, што Дубейкоўскі і Алексюк выпэйпадазрэньне ў сэнсе лёяльнасьці да Польшчы.

Ярэкі скрыўджана просіць прадсед. звольніць яго ад выказываніа асабістых яго ўзглядаў на Дубейкоўскага і Алексюка.

Врубл. Я, зразумела, не дамагаюся адказу. Для мяне важна толькі паказаць, што зьезд меў больш шырокае значэньне і што адна толькі прысутнасьць на зьездзе зусім нічога не даказывае. Сьведка сказаў, што апрыч адкрытых паседжаньняў зьезда, на якіх ня было мовы аб збройным паўстаньні, зьезд меў тайнае паседжаньне, на якім і была прынята рэзалюцыя а барацьбе з польскім урадам усімі спосабамі ўключна да збройнага паўстаньня.

Скуль сьведка мае гэтыя весткі?

Ярэц. Ад майго „вывядоўцы“, які быў на зьездзе.

Врубл. Які прымаў удзел і ў гэтым „сэкрэтным“ паседжаньні?

Ярэцк. Але.

Врубл Гэтыя весткі згаджюцца з паказаньнямі Маслоўскай, калі толькі будзем меркаваць, што мова ідзе аб паседжаньні палітычнай сэкцыі, на якім Маслоўская, паводле яе словаў, зрабіла прапазіцыю, якая была аднагалосна прынята проці аднаго... Аляксюка.

Маўская сьцьвярджае гэтае паказаньне.

Врубл. Гэты „вывядоўцы“, які, разумеецца, не галасаваў за паўстаньне проці Польшчы, быў Аляксюк?

Ярэцк. Маўчыць.

Прак. Ці сьведка ня ведае, ці ня былі пасьля Праскага зьезду яшчэ якія-небудзь беларускія зьезды, напр.—у Вільні?

Ярэцк. Былі зьезды ў часе выбараў.

Прак. А ў апошні час?

Ярэцк. Быў зьезд дзеячоў беларускай школы.

Прак. А палітычных ня было?

Ярэцк. Не. Было сьвяткаваньне абвешчаньня г. зв. „незалежнасьці Беларусі“. Але гэткай „незалежнасьці“ ніколі ня істнавала. Есьць толькі быццам самастойная Савецкая Беларуская Рэспубліка і г. зв. „Урад Ластоўскага“, які ня мае ніводнага кв. мэтра ўласкай торыторыі і знайходзіць прытулак у Коўні.

Прак. Ці сьведцы ня ведама хто быў на гэтым сьвяткаваньні?

Ярэцк. Было шмат беларускіх палітычных і культурных дзеячоў, паслы...

Прак. А з небеларусаў?

Ярэцк. (успамінаючы)... Былі прадстаўнікі літооўцаў, палякаў...

Прак. (дапытываючыся), а хто быў з палякоў?

Ярэцк. Быў сэнатар Крыжаноўскі...

Прак. (зьдзіўлена) Сэн. Крыжаноўскі... А з прысутных тут ня было нікога?

Ярэцк. робіць надлюдзкія высілкі, каб успомніць, але зьнямогшы заяўляе, што прыпамятаваць ня можа..

Трэба ўважаць, што пракурор, які акаваўся у гэтым выпадку лепей паінфармаваным, чым сам шэф дэфэнзывы, хацеў, відаць, праз вусны аўторытэтнага сьведкі заявіць на публічным паседжаньні суда аб тым, што на сьвяткаваньні былі прысутнымі абодвы віленскія абаронцы і „разам“ скампраматавапь „іх польскасьць“ у вачох суда...

На жаль, і тут памяць здрадзіла сьведцы Ярэцкаму і пракурор tempus et oleum perdidit. Можам, з свайго боку, дадаць, што сьвяткаваньне адбылося з дазволу ўладаў.

Абар. Врублеўскі расказвае суду гісторыю абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, падкрэсьліваючы, што акт абвешчаны ў часе нямецкай акупацыі 25 сакавіка 1918 г.

Сьв. па просьбе абар. Врублеўскага азнаёміўся з прадстаўленнымі апошнім газэтнымі матар'яламі аб Праскім Зьездзе, робіць дапаўняючыя ўвагі аб прачытаным.

Рэзолюцыі, надрукованыя ў эсэраўскай газэце „Воля Народа“, прызнае запраўднымі.

Прызнае, што рэзалюцыі заклікаюць да рэвалюцыйнай дзеяльнасьці усімі магчымымі срэдствамі і проці ўсіх дзяржаваў, падзяліўшых Беларусь, але фактычна гэтая дзеяльнасьць была пакіравана толькі проці Польшчы, бо Літва і Расея прыязна адносіліся да Беларусаў. Аб іншых, як Латвія, гаварыць ня варта.

З рэзалюцый відаць ясна, што на Зьездзе была прынята рэволюцыйная, а не эволюцыйная тактыка, і фактычна рэзолюцыя гатавалася толькі проці Польшчы.

Абар. Врублеўскі. Ці сьведка зьвярнуў увагу на катэгорычны выраз у рэзалюцыях: „ня хочам ні Масквы ні Варшавы“?

Ярэцк. Так. Але гэта-толькі рэзалюцыя, а на дзеле—барацьба проці аднэй Польшчы.

Абар. Врублеўскі Сьведка казаў аб асыгнаваных Нямеччынай на беларускую справу 40.000.000 мар. А ці ведама сьведцы, што немцы, выходзячы з Украіны, вывезлі з сабою ў Бэрлін вялікія сумы ўкраінскіх грошай, з якіх аж дагэтуль карыстае украінскі рух; магчыма што з гэтага ж фонду бяруць срэдствы і беларускія аналёгічныя арганізацыі.

Ярэцк. гаворыць, што аб такіх фондах ня чуў.

Прадс. пытае, ці ня можна адпусьціць сьведку, якога патрэбуюць у Штаб яго службовыя абавязкі.

Абар. Врублеўскі. Сьведка, як адзіны сьвядомы палітычна чалавек з усіх сьведкаў абвінавачаньня, канечна патрэбен для абследаваньня прадстаўленых Суду докумэнтаў.

Пракур. вымаўляецца, за звальненьне сьведкі з прычыны займанай ім высокай пасады і неабходнай патрэбы вярнуцца ў Штаб.

Суд дазваляе сьведцы на сёньняшні вечар ня быць прысутным на Судзе, проці чаго Врублеўскі не спраціўляецца і бярэ ад сьв. Ярэцкага слова, што пры патрэбе ён зьявіцца для ўдзелу ў судовым сьледзтве.

З газэтных матар'ялаў, якія прадставіў абар. Врублеўскі, абвяшчаецца надрукаваная ў органе Аляксюка „Еднасьць“ яго прамова на зьездзе ў Празе, якая заклікае да супрацоўніцтва з Польшчаю, але востра выказваецца проці акупацыйнай палітыкі Польскай ўлады; абвяшчаецца таксама вынятак з прамовы дэлегата ад Горадзеншчыны аб тым, што ніхто з беларусаў ня прыме арыентацыі Аляксюка, але ўсе будуць за Ластоўскага.

Сьведка Ян Алькевіч.

Скарбовы падлясьнічы ў Белавежскай пушчы.

Сьведка падрабязна апаведае аб нападзе бандытаў Шыманюка на ягоны дом 7 красавіка 1922 г.

А 10-й гадз. увечары да яго ў хату ўварвалося 6 бандытаў і спыталі, ці ведае ён паліцыянта Голэмбіоўскага. Атрымаўшы пацьверджаючы адказ, заявілі, што значыць ён — польскі шпіон і будзе растрэлены. Загадалі сьведцы і двом яго сынам 15 і 17 гадоў апрануцца і зьвязаўшы ім рукі павялі ўсіх у пушчу. Двое бандытаў засталіся разам з жонкаю сьведкі ў хаце і пачалі рабунак.

У пушчы сьведка здалеў неяк разьвязаць сабе рукі і, зьбіўшы лоўкімі ударамі ў нос двох бліжэйшых бандытаў, уцячы ад пагоні.

Прыйшоўшы раніцаю ў вёску Істокі, ён заявіў аба ўсім пастарунку паліцыі.

Прыбыўшы раніцаю дамоў знайшоў поўны пагром. Усё была зрабавана; забраны вопратка, бялізна, спрат, золата, срыбра і грошы; забрана карова; зьніклі запасы харчоў.

У нападзе прыймаў удзел Корч (схаваўся разам з Шыманюком), якога сьведка ведаў раней. З арыштаваных потам бандытаў пазнаў Андрэя Тамашука, Панцалея Нічыпарука, а з абвінавачаных цяпер пазнае Івавюка, Ал. Нічыпарука, Вольфа, Ан. Захожага, але ніводзін ня быў у нападзе апрача Іванюка, які таксама ў рабунку ня прымаў удзелу, а толькі стаяў на варце.

Ад засуджанага і памёршага ў турме Нічыпарука і ад жонкі Скамароха сьведка даведаўся дэталі забойства жонкі і двох сыноў у пушчы.

Нічыпарук паказаў мейсца, дзе закапаны трупы.

Апаведаючы аб гэтым сьведка плача...

На пытаньні пракурора кажа, што Ан. Захожы насіў пісьмы ў пушчу. Вольфа неяк спаткаў едучы з возам у напрамку да схову бандытаў. Крата ня ведае.

Затым сьведка дэтальна апаведае, як ён веў праз пушчу ў логава бандытаў сільны аддзел паліцыі, камандараваны, каб схапіць банду Скамароха.

Апаведаньне надта цікавае. Сьведка вельмі сур'ёзна адносіўся да гэтай важнай і небясьпечнай справы і быў моцна зьдзіўлены тым, як заховаўся экспэдыцыйны аддзел. — Паліцыянты зьбіраліся ў купы, голасна гутарылілі, курылі, ня слухалі перасьцярогаў і радаў свайго спрактыкаванага праваднікa... Моцна адставалі ад яго.

Разультаты гэткай „нячаканай лоўлі бандытаў“ хутка выявіліся. Сьведка апаведае, як, зайшоўшы наперад, ён убачыў аднаго паліцыянта, які на злом галоў бег міма яго. Прыглядзеўшыся лепей сьведка зразумеў, што гэта не паліцыянт, а пераапрануты бандыт. І тут-жа сьцяміў, што сакрэт іхняй „таёмнае аблавы“ выкрыты, што цяпер справа ў шыбкасьці. Стрэліў у бандыта, але ня трапіў... Бандыт зьнік, і ў той-жа час сьведка пачуў працяглы гук дудкі, такі самы, які ён чуў у часе нападу на свой дом...

Але і пасьля гэтага ня можна было дабіцца якога-небудзь ладу і пляну ў безнадзейным аддзеле паліцыі...

Калі ён першы (!) ўвайшоў у логава бандытаў дык нікога ня ўбачыў... Папярэджаныя бандыты пасьпелі спакойна зьнікнуць.

У логаве сьведка бачыў многа коўдраў, падушак, сяднікаў; быў вялікі запас хлеба, сала, водкі..

Потым... прышла... паліцыя.

Аб. Кланк Сьведка спаткаў абвін. Вольфа, што ехаў у логава бандытаў. Ці гэтая дарога вяла толькі да мейсца, у каторым хаваліся бандыты, ці па ём можна было выехаць і ў іншае мейсца.

Сьведка. Так. Можна было, скіраваўшы далей у бок, выехаць з пушчы.

Сьведцы паказваюць розныя рэчы знойдзеныя на вобысках у Андр. Тамашука і інш. Шмат з іх сьведка прызнае сваімі, а Суд пастанаўляе зьвярнуць іх сьведцы.

Абвінав. Маслоўская просіць слова і выражае пацярпеўшаму ад бандытаў сьведцы, няшчаснаму мужу і бацьку глыбокае спачуваньне ад сябе і ад імя той ідэйнай арганізацыі, на чале якой яна знайходзілася.

Пасьля перарыву з 3 гадз. 20 мін. да 6—15 паседжаньне пачынаецца ізноў.

Сьведка Петра Краўчук.

Жыхар в. Грабоўцы, Бельск. пав.

З гэтае вёскі што і Шыманюкі. Робіць уражаньне неданошанага, тупаватага, але хітравагага.

На пытаньні суда адказывае, што нічога ня ведае, што яго ў паліцыі білі і што ён нічога ня памятае, што паказваў там.

Прадсед. А сьледчы-ж ня біў?

Краўчук. Не.

Абвяшчаюцца паказаньні сьведкі ў сьледчага судзьзі, дзе сьведка гаварыў, што Шыманюк намаўляў людзей уступіць у арганізацыю і плаціў грошы.

Сьв. Краўчук ізноў кажа, што ён нічога ня ведае. Ня бачыў нічога, а толькі чуў. „Паліцыя мяне біла і напісала ўсё гэта“.

Абар. Славінскі просіць каб суд дазволіў дзеля высьненьня ўсей справы гаварыць з сьведкаю пабеларуску.

Справа запраўды выясьняецца вельмі хутка.

Выяўляецца, што Краўчук... Украў у кагось парасё, мала што ні ў самога Шыманюка. Каб загладзіць свой грэх, сьведка пайшоў на пастарунак і заявіў усё што было „ведама“ аб Шыманюку... А разам папрасіў пасады ў паліцыі...

Альжб. Шыманюк падхапляе вясёлы матыў у гусьце роднага тэатра-буф і падцьверджае, што Краўчук, украўшы парасё, спалохаўся і абгаварыў яе мужа. Краўчук казаў ей: „баюся, што мяне пасадзяць. Я знарок прысягну, але скажу на Шыманюка, бо мяне пасадзяць“.

Гэтая вясёлая дэталь усё-ж такі паказвае ясна, ў якой атмасфэры рабілася сьледзтва на мяйсцох і шуканьне паўстанчай арганізацыі.

Нават такі дубагаловы сьцяміў, што нават крадзеныя парасяты котырываліся тады на мяйсцовай „палітычнай біржы“...

Сьведка Язэп Перкоўскі.

Пастарунковы з Кляшчэляў.

Апаведае аб нападзе на пастарунак у мястэчцы, дзе была таксама і яго кватэра. Кажа, што бандытаў было чалавек 10.

Перад нападам кіраўнік пастарунку атрымаў з пошты пісьмо, пісанае парасейску. Пісьмо абвешчаецца. Вось яно:

„Панове бандиты в Клещелях! Согласно приказу атамана Скомороха, я начальник отряда террористов Иван Чорт предупреждаю вас, что ежели вы, польская св....., не прекратите избіеній и наглых издѣвательств над нашими братьями бѣлоруссами во время арестов, то вы все за ваши преступленія будете повѣшены на телеграфных столбах. Не забывайте, что вы все живете среди нас и наши глаза всюду слѣдят за вами. Помните, что близится час расплаты. Коменд. отр. террористов Чорт“.

Сьведка падцьвярджае згоднасьць пісьма.

Пракур. На канвэрце была пячатка „Братство белорускіх крестьян“?

Сьведка. Была нейкая пячатка, але ня мог разглядзець

Суд разьглядае пячатку праз павялічанае шкло. Слова „Братство“ відаць ясна, а далей разгледзець ня можна.

На пытаньне пракуратора сьведка адказвае што Рошчанку добра ведае, нават жыў разам з ім у аднэй хаце, але таго, што ён належыць да банды ня ведаў.

ПЯТЫ „ДЗЕНЬ ПРАЦЭСУ.

Паседжаньне аднаўляецца а 10 гадзіне 25 м. раніцы.

Абаронца Врублеўскі прадстаўляе Суду: 1) экзэмпляр Устаўнае граматы, выданае Радаю Беларускай Народнай Рэспублікай ў Менску.

2) блянкі дыплёматычнага пашпарту, выданага ўрадам Ластоўскага сваім паўнамоцнікам і пашпартнай кніжкі, выдаванай ад імя Беларускай Народнай Рэспублікі грамадзянам яе... Беларускім Нацыянальным Камітэтам Дубейкоўскага ў Варшаве.

Врубл. Мне ўдалося знайсьці гэтыя блянкі і экзэмпляр граматы ў маіх калекцыях. Я прашу Суд азнаёміцца з Устаўнай Граматай і дазволіць паказваць у ёй толькі на дату.

Што датычыць пашпартоў, дык розьніца паміж „дыплёматычным“ пашпартам ураду Ластоўскага, які выдаваўся яго чыноўнікам заграніцай, і знойдзеным пашпартам на імя Барана адразу кідаецца ў вочы: фармат блянка, тэкст і інш., усё ў іх featurelessрознае.

Розьніца-ж паміж пашпартнымі кніжкамі, выдаванымі грамадзянам Беларускае Народнае Рэспублікі, як Ластоўскі ў Коўні, таксама і Дубяйкоўскім у Варшаве, зусім нязначная,—форма, разьмер, тэкст, расклад тэксту, — усё амаль што аднолькавае. У гэтым лёгка пераканацца пры параўнаньні пашпарта Барана з паказаным праз мяне блянкам Дубяйкоўскага.

Суд пастанаўляе здаволіць просьбу абар. Врублеўскага.

Абар. Бабянскі просіць запісаць у пратакол словы абвінавач. Веры Маслоўскай. выражаючыя спачуцьцё сьв. Алькевічу з прычыны гібелі яго сям'і.

Суозьдзя Здроеўскі з нядобраю староннасьцю пытае Маслоўскую, як яна выражае свае спачуваньне: як чалавек, ці — як член арганізацыі ад імя гэтай арганізацыі, — значыць ганючы падобную дзейнасьць арганізацыі...

Вера Маслоўская (рэзка і выразна). І як чалавек і ад імя арганізацыі, на чале якой я стаю, і якая ня мае нічога супольна з забойствамі.

Пачынаецца дапрос сьведкаў.

Сьведка Людвік Сьлюсарчык.

Кіраўнік III Аддзелу Палітыч. 5 ф. Дзярж. Паліцыі у Беластоку.

Сьведка выяўляе з сябе, як і кап. Ярэцкі, ня меней цікавы і тыповы экзэмпляр з тае паліцэйскае пароды якая гэтак пышна прышчапілася і размножылася сярод асаблі спрыяючых варункаў, створаных польскаю дзяржаўнасьцю на нашых Крэсах. Сярод прайшоўшых перад намі паліцэйскіх тыпаў рэфэрэнт Сьлюсарчык займае па сваей пасадзе другое, значна ніжэйшае пасьля кап. Ярэцкага мейсца. Калі кап. Ярэцкага можна прызнаць, гэтак кажучы. за адзінку, інтэлігентам дэфэнзывы, дык пачынаючы з рэф. Сьлюсарчыка па стромай драбіне ідуць уніз толькі дробы. Затое заміж, зьмяншэючайся інтэлігентнасьці, шпарка узрастае каштоўны наагул на „паліцэйскім Усходзе Эўропы“, асабліва на „Усходніх Крэсах Польскай Рэспублікі“ элемэнт волі, „характару, моцных нэрваў“ У гэтым п. Сьлюсарчык, як выясьнілася са ставак з абвінавачанымі. займае сярэдняе мейсца паміж кап. Ярэцкім і Гадэйскім.

Сьведка мае слабую лёгічную памяць і ня можа памятаваць усяго стройнага абраза паўстаньня, які быў намаляваны ў абвінавачаваюакце.

Ен дае толькі асобныя часткі з яго. Усё гэта мы ўжо ведаем з арыгінальнага апавяданьня запраўднага аўтара Ленкевіча, на якога п. Сьлюсарчык часта падаецца, бяручы адтуль цэлыя фразы.

Падаем найбольш важнейшае.

Мэтаю арганізацыі было—адарваньне ўсяго Краю ад Польшчы аж па Буг... Выкрыць арганізацыю было надта трудна. Але Ленкеіч выкрыў... Баранаў быў назначаны Горадзенскім ваяводаю, знаходзіўся бязупынна ў зносінах з Хмараю-Разумовічам. Маслоўская была арганізатарам. Аўг. Матэйчук—кур'ерам. К. Матэйчук—вайскавым інструктарам, і г. д.—усё мы ўжо ведаем. Паўстанская арганізацыя працавала пад фірмаю легальных інстытуцый: каапэратываў, школаў, асьветных гурткоў і г. д. Дзеяльнасьць арганізацыі, як гэта вымагалі загады Хмары, мелі рэволюцыйны, вайскова-падгатаваўчы, агітацыйны і шпігоўскі характар. Выразна і рэзка антыпольская ідэолёгія мела канечнаю сваею мэтаю—незалежнасьць Беларусі. Бандытызм ня ёсьць толькі вынікам таго, што арганізацыя пазбылася сваіх ідэйных, палітычных правадыроў, ад часу арышту іх. Цэлая чарга бандыцкіх нападаў—ёсьць помста за гэтыя рэпрэсіі. У „ультыматуме“ быўшаму тады Начальніку Дзяржавы Я Пілсудскаму аб гэтым гаворыцца зусім выразна: арганізацыя пагражае тэрорам, калі ня будзе зьмены палітыкі ўціску беларусаў. Выяўленьнем гэтага пляновага тэрору зьяўляецца чарга забойстваў, пажараў, грабяжоў. Мелася адбыцца яшчэ шмат такіх акцый, але працяг іх быў спынены разбурэньнем арганізацыі. Было вызначана ўзарваць будынак Д. О. К. у Горадне, мост на Немане і гд. Першая партыя ўчасьнікаў арганізацыі, засуджаная і казьненая надзвычайным судом у прошлым гаду,—бязумоўна складае адно цэлае,—сувязь выяўлена.

Прадсед. Што сьведка ведае конкрэтнага аб кожным абвінавачаным паасобку?

Сьведка. Пэўна і дэтальна не магу сказаць... Надта многа абвінавачаных.., Ня памятаю. Але я падтрымоўваю ўсё тое, што я гаварыў у сьледчага судзьзі.

На пытаньні прадсед. аб чарзе абвінавачаных падае ўзятыя з абвінавачанагага акта агульныя характэрыстыкі не паказваючы конкрэтных фактаў—Маслоўская—галоўная арганізатарка .. Аўп. Матэйчук — кур'ер арганізацыі... К. Матэйчук — вайсковы інструктар і г. д.

Прадсед. Скуль сьведка мае гэтыя весткі: ці ён сам устанавіў усё гэта, ці гэта — інфармацыі агентаў?

Сьвед. Гэта—паказаньні на дапросах і інфармацыі агентаў. Добра ня памятаю.

Прасед. Што сьведка ведае аб Паруку?

Сьведка. Парук, здаецца, Аляксандар... (Паказваюць Парука). Гэты самы... меў сувязь з Маслоўскай і шмат з кім з абвінавачаных...

Прадсед. Скуль сьведка мае весткі аб прыналежнасьці Парука да арганізацыі?

Сьведка. З актаў дазнаньня. (Напружана ўспамінаючы) Аўгеньня Матэйчук паказала, што Парук быў членам арганізацыі.

Сьведка Сьлюсарчык расчыняе таўсты сшыток, заглядае ў яго і просіць у Прадсядацеля дазволу карыстацца „нотаткамі“...

Прадсед. праглядзеўшы некалькі лісткоў мягка заяўляе, што гэта-ж—паказаньні абвінавачаных ў сьледчага... і уласныя паказаньні сьведкі.—І, яшчэ мягчэй тлумачыць, што карыстаца такімі нататкамі на судовым сьледзтве ня можна.

„Пазбаўлены „шпаргалкі“, сьведка зьяўляецца безабаронным. На пытаньні прадседацеля аб абвінавачаных з натугаю ўспамінае самыя агульныя выражэньні акта абвінавачаньня, урэшце, заяўляець, што па абедзьвух справах Горадзенскага і Беластоцкага працэсу такая маса абвінавачаных і сьведкаў, што ён ня можа помніць усіх і ўсё, аб чым, як кіраўнік Палітычнага Аддзелу знаў і паказаў на сьледзтве.

Пракур. Сьведка—кіраўнік III рэфэрату Экспозытуры 5 f. Пол. Панст. у Беластоку.

Сьвед. Так.

Пракурор просіць агаласіць паказаньні сьведкі ў сьледавацеля.

Прадседацель чытае паказаньні сьвед., прапускаючы тое, што ня тычыцца да Беластоцкага працэсу, а належыць да Горадзенскага. Манатоннае чытаньне перарываецца перахадзячым аркестрам ваеннай музыкі. Па просьбе абар. Бабянскага перарывае чытаньне, каб „даць магчымасьць абвінавачаным паслухаць крыху музыкі“.

Чытаньне...

Паказаньні сьвед. Сьлюсарчыка займаюць поўгадзіны... Ясна, усё гэта, як выразілася абарона „элеборат“, г. ё. компіляцыя з чужых паказаньняў... і значэньня, як паказаньне сьведкі, мець ня можа,—хоць бы ўжо дзеля таго, што помніць і паўтарыць усё на судзе мог-бы толькі які-небудзь Кювье ..

Сьледавацель Ясінскі, як відаць, аказаўся куды менш строгім да „нататкаў“ сьведкі, як прадседацель... Яго паказаньні там прадстаўляюць у сутнасьці копію службовага дакладу сьведкі па начальству... Сьведка падцьвярджае свае паказаньні.

Але гэтыя агалошаныя паказаньні сьведкі Сьлюсарчука даюць багаты матэр'ял для характарыстыкі прыёмаў самай работы агентаў і конфідэнтаў паліцыі...

Якую масу часу і працы затрачываюць такія сумленныя чыноўнікі паліцыі, як сьведка Сьлюсарчук, на дапросе нявінных—абгавораных такімі агентамі як Тустаноўскі ці Лазараў. Напр., Лазараў абгаварыў да 2 дзесяткаў асоб, з якіх некатарыя нават былі вызваны на суд, як сьведкі з боку абвінавацелеў... І такіх выпадкаў шмат ..

Прак. Што сьведка знаець аб дзейнасьці Барана падробна і з якіх крыніц ішлі ведамасьці.

Сьведка. Баран — вядомы беларускі дзеяч у Горадзеншчыне рэволюцыйнага напрамку, быў у знозінах з Разумовічам. Быў на зьездзе ў Праве і падпісаў вядомую антыпольскую дэкляраціцыю. Падтрымліваў ажыўлённыя адношаньні з самымі выдатнымі сябрамі арганізацыі Маслоўскай. Матэйчукамі, Паруком.

Сьведка аб Барану многа знаў, многа чуў, як шэф Паліт. Ад. Пал. Ведамасьці меў афіцыяльныя ад кіраўніка такога жа Аддзелу ў Горадні.

Аб. Бабянскі. Які раён дзейнасьці падлегаў сьведку?

Сьведка. Беластоцкі вокруг Пал. Панст.

Аб Бабян. Горадзеншчына уваходзіць у яго?

Сьведка. Але, як часьць Беластоцкага ваеводзтва.

Аб. Бабянс. Значыць сьведка меў ведамасьці ад рапартаў падлегаючых яму аддзелаў Горадзенскай паліцыі. А каго сьведка дапрашываў сам. аб кім меў сам непасрэдныя ведамасьці?

Сьвед. Добра ня помню.. Многіх...

Бабян. А сьведка прымаў учасьце ў дазнаньні і па Горадзенскай справе?

Сьвед. Так.

Бабянс. А ўсе гэтыя ведамасьці аб штабе ў Мэрачы і т. д. адкуль у сьведкі?

Сьвед. З актаў дазнаньня і паказаньня завераных агентаў.

На пытаньне абаронцы Рэйнгарда аб Захарчуку, Рошчэнку Андр. Сьведка адказываець, што добра ня помніць. але што яны ёсьць у яго паказаньнях.

Рэйнгард. Было двох Захарчукоў—Ян і Язэп. Ці сьведка не блутаець іх?

Сьвед. (няпэўна) Не.

На пытаньні абароны аб Маслоўскім і Разумовічу гаварыць самыя агульныя словы: высокі рост, літоўскі афіцэр, варожыя Польшчы...

Аб. Врубл. Сваіх поглядаў аб Баране ў сьведкі няма? Ці ня можа ён сказаць канкрэтна той ці іншы факт з дзейнасьці Барана?

Сьведка Не, я меў данясеньні з Горадні. Адзельных фактаў ня помню.

Врубл. Сьведка ня можа паказаць падробна крыніцу ведамасьцей аб Баране?

Сьведка. Ізноў ссылаецца на данясеньні і факты.

Аб. Славінскі. Што сьведка знаець аб Грыгасе?

Сьвед. (прыпамінае) Грыгас жыў... на... вёс.. Даржэлях. Займаўся перавозкай праз граніцу ў Мэрач. Меў шмат у сябе літоўскай агітацыйнай літэратуры. Перавозіў за плату сяброў арганізацыі. Быў верным літоўцам... Не, пэўней быў беларусам, але лічыў сябе літоўцам.

Аб. Міцкевіч. Сьведка рабіў дазнаньне асабіста?

Сьвед. Так, многіх...

Аб Міцкевіч. У сябе ў Беластоку, у памешчэньні Аддзелу.

Сьвед. Так.

Аб. Міцкевіч. Сьведка сам дапрашываў, напр. абв. Крата?

Сьвед. Ня помню.

Абв. Крот. А я дык цераз меру добра помню... Буду помніць усё жыцьцё... Гэты пан быў і дапрашываў мяне, толькі ён быў тады ў цывільным... І мяне ён помніць.

Сьведка прыглядаецца і посьле. адвярнуўшыся ад Краты, кажа, што ня помніць.

Абв. Крот. Я пану прыпомню. . І Крот пачынае падробна расказываць, як яго ў прысутнасьці шэфа Палітычнага Аддзелу Беласт. П, П, білі... Білі рэвальвэрнай ручкой... Выбілі зуб... Паказываець выбітае мейсца ў роце. Паказаньне даў, якое прыказалі... Паказаў-бы ўсё..,

Сьведка. Кажа, што Крата ня помніць, што яго пэўна ня было. Што да біцьця, дык дапросы рабіліся ў прысутнасьці служачых, уваходзячых інтарасантаў—значыць біцьцю не магло мець месца. Апрача тага, ды наагул такіх способоў дапросаў не ўжывалася...

Аб. Кланк. Сьведка Мацэевіча таксама сам дапрашываў?

Сьведка. Так.

Аб. Кланк (паказваючы на вызванага Мацэевіча). Гэтага?

Сьведка. Так.

Абвінав. Мацэевіч. Ен помніць мяне добра. Павінен помніць. Пры дапросе ён прыказываў мяне разапранаць пры кабетах... Мяне білі, рвалі за валасы. Я падпісаў ўсё, што мне напісаў не прачытаўшы нават.

Сьведка кажа, што усё гэта няпраўда.

Сьведка Рамуальд Зямкевіч.

На пытаньні абаронцы *Врублэўскага* расказвае аб Горадзенскім Нацыянальным Камітэце, якога сам быў сябрам і якога Баран быў старшынёю, а Якавюк сэкрэтаром. Бальшавікі надта варожа рэагавалі на істнаваньне гэтага камітэту дзеля таго, што ён карыстаўся падтрыманьнем польскай улады. З гэтай прычыны Камітэт пры бальшавікох не істнаваў, а вісеў толькі на валаску. Асабліва Якавюку надта пашкодзіла, знойдзенае бальшавікамі ў яго ў часе вобыску просьбу на імя Начальніка Дзяржавы Пілсудскага па прыватнай справе, напісаная ў вельмі гарачых выразах. Апрача таго, што Камітэт меў урадовае падтрыманьне ў першыя часы польскай улады, бальшавікі адносіліся да яго няпрыхільна за тое, што ён меў нацыянальны „буржуазны“, а не клясовы і рэвалюцыйны характар. Усё гэта прывяло да таго, што Баран і Якавюк, як быўшыя на чале камітэту, былі арыштованы „Асобным Аддзелам“ і пры адходзе бальшавікоў; вывезены ў Смаленск. Па дарозе Якавюк уцёк назад і хаваўся ў Горадні.

Прак. Чаму арыштавалі Барана і Якавюка, а ня сьведку напрыклад?

Зямк. Аб маей сувязі з камітэтам ня ведалі. А ў Барана пры вобыску была знойдзена папера на блянцы камітэту за ягоным подпісам і Якавюка... Не функцыянаваўшы пры бальшавікох камітэт, калі вярнуліся паляки з дазволу польскіх уладаў зноў распачаў сваю дзейнасьць.

Аб. Врубл. Ці сьведка ня ведае, хто быў камэндантам Горадні пры бальшавікох?

Зямк. Прозьвішча не памятаю. Нейкі расеец.

Аб. Врубл. Не беларус? Не Разумовіч?

Зямк. Напэўна не.

што дужа не даўспадобу Англіі. Узбраеньне Францыі падняло вялікі шум і непакой сярод урадовых кругоў Англіі, якія аткрыта разгледаюць гэтае пытаньне.

З газэт.

„Выхадка чэскае газэты“.

Пад такім загалоўкам эндэцкая „Gazeta Warszawska“ перадрукавала стацьцю чэскае часопісі „Czske Slowo“, з якое мы ў свой чарод адзначаем найбольш характэрныя адрыўкі, што сьведчаць аб ня лішне прыязных адносінах паміж дзьвюмя суседкамі, каторых Францыя стараецца за ўсякую цану „пажаніць“. У чэхаў з Польшчай ідзе спорка аб невялічкі кусок зямлі на граніцы паміж імі. Гэта—Явожына. У справе аб Явожыну рада амбасадораў ужо раз выказала свой прынцыповы погляд. Але пры вырашэньні споркі на практыцы стораны не дайшлі да згоды Польшча тады зажадала, каб справа пайшла на новы разгляд, лічучы, што старымі пастановамі справа была разьвязана І „Czeske Slowo“ перасьцярагае Польшчу, кажучы, што новы разгляд некаторых пытаньняў, якія палякі лічаць разьвязаными, можа быць для іх самых непажаданым:

„З гэтым павінны лічыцца асабліва палякі, бо вельмі лёгка маглобы здарыцца, што тая самая канфэрэнцыя амбасадораў можа надумацца і ў справе Усходняе Галічыны і ўсходніх граніц Польшчы зрабіць другую пастанову, чым раней. Палякі павінны незабываць, што гэныя усходнія граніцы не забясьпечаны і ня будуць забясьпечаны ў будучыне ніякімі умовамі, і што прыдзе мамэнт, калі спорка аб гэту справу будзе цікавіць і нас.“

Як бачым, чэская газэта мае на думцы спорку, што можа узьняцца паміж Польшчай і Расеяй. Ведама ў гэтай спорцы чэхі будуць вельмі зацікаўлены, што будзе з Усходняй Галічынай, якая гранічыць з Чэха-Славакіяй і, калі-б належала да Расеі, адкрывала-бы чэхам простую дарогу да расейскіх рынкаў....

Далей „Czeske Slowo“ зачапляе справу нацыянальных меншасьцей:

„Палякі такжа гавораць аб нашых нацыянальных меншасьцях. Просім іх пакінуць ужо гэта. Аднак, калі і далей хочуць аб гэтым гутарыць, дык зусім шчыра прапануем ім, што дойдзем з імі ляяльнае угоды і дамо палякам у нас усе тыя правы, якія палякі дадуць у Польшчы немцам, жыдом, русінам і літвіном. Калі палякі гэтае прапазыцыі ня прымуць, дык няхай лепш аб усей справе памаўчаць, бо маглі-бы выявіцца вельмі няпрыемныя для іх рэчы“.

„Просім такжа палякоў, каб далі ў сябе немцам, жыдом, русінам і і літвіном усё тое, што мы дамо палякам у Чэха-Славакіі. Калі гэта станецца, могуць палякі гаварыць аб меншасьцях у другіх дзяржавах“.

Судзячы з тону чэскага поўофіцыозу, Францыі будзе нялёгка зьдзейсьніць свой плян пагадзіць Польшчу з Чэхіяй і—больш таго—давясьці да ваенна польска-чэскага саюзу. Чэхі, як ясна кажа „Czeske Slowo“, баяцца, што Польшча зажадае для сябе першага кіраўнічага месца ў праектаваным французамі аб'еднаньні Польшчы з Чэхіяй і так-званай „малай антантай“.

Абгаварываючы стацьцю чэскае часопісі, „Gazeta Warszawska“ напамінае другое выступленчне тэйжа газэты проці Польшчы ў часе польскага паўстаньня ў Горнай Сілезіі (Сьлёнску): „Czeske Slowo“ пісала тады вось як:

«Абавязак саюзных гаспадарств —палажыць канец польскім авантурам і павучыць нашых неспакойных суседзяў, што іхняя палітыка пазбаўляе іх сымпатыі ўсяго сьвету. Карысьць вялікае і малое антанты вымагае энэргічнага выступленьня проці Польшчы.

„Gaz. Warsz.“ асаблівы націск кладзе на тое, што стацьцю гэную перадрукавала на першым месцы і пражская нямецкая газэта „Prager Presse“,—поўурадовы орган чэскага міністэрства заграгічных спраў.

Цікава, ці і на гэтае выступленьне міністэрства пана Сэйды нашле чэхам ноту пратэсту, як паслала немцам з прычыны процi-польскае прамовы прускага міністра Браўна.

З польскага Сойму.

Канец сэсыі.

28 чэрвеня закончыў сваю працу польскі Сойм, і дэпутаты разьехаліся на месячны адпачынак. 23 ліпня праектуецца кароткая сэсія дзеля правядзеньня бюджэту, а пасьля—ізноў адпачынак на даўжэйшы час.

Хаця йшчэ далёка да году ад пачатку прац гэтага сойму, ўсё-ж парлямэнтарны год можна чічыць закончаным. Ад восені пачнецца новы цыкль соймавых работ. Вось, ня шкодзіць зрабіць хоць зусім кароценькі агляд, што даў гэты год нам, беларусам, і што зрабілі за гэты час нашы паслы.

На вялікі жаль, хваліцца няма чым. Беларусам сойм нічога не даў: ні школы ў роднай мове, ні зямлі, ні канстытуцыйных свабод. А калі што і даў, дык як раз тое, проці чаго горача пратэстуе ўвесь наш народ і нашы паслы: сойм узмацаваў калянізацыю нашае зямлі польскімі „асаднікамі“, ды вызначыў цэлы рад новых падаткаў.

Ня гледзячы на гэта, ня гледзячы на немагчымасьць дабіцца праз сойм спаўненьня хаця-бы невялікае часьціны нашых нацыянальных дамаганьняў, мы сьмела можам сказаць; што бытнасьць нашых паслоў у сойме не аказалася зусім бяэплоднай. Супроць волі і жаданьня напэўна блізу ўсіх паслоў мы—ткі выкарысталі на свой спосаб соймавую трыбуну.

Польская палітыка звычайна старалася *укрыць* самае існаваньне ў межах Польскае Рэспублікі звыш двух міліёнаў беларускага насяленьня, укрыць існаваньне тут беларускага пытаньня. Дзеля гэтае мэты з урадовага ужытку выкінулі самае імя Беларусі, ахрысьціўшы Заходнюю Беларусь імем „Kresy Wscnodnie“, а ў статыстычных атлясах і публікацыях лічба беларусаў пачала з кожным днём таяць і дайшла да траціны таго, што ёсьць запраўды. „Спэцыяліст да гэткіх спраў, праф. Ромэр, проста „перапраівіў“ цыфры, якія ў 1915 годзе быў вывеў для беларусаў. І польскаму народу кіраўнікі ўрадовае палітыкі стараліся даказаць, што ў Польшчы *ніякага беларускага пытаньня няма.* На гэтай аснове пры укладаньні дзяржаўных бюджэтаў урады не стаўлялі ніякіх асыгновак хаця-бы на культурныя патрэбы беларусаў, на здаваленьне найбольш пільных запросаў нашага жыцьця.

Такія-ж баламутныя ведамасьці аб беларусах пашыраліся і заграніцай.

Пабеда беларусаў на выбарах у сойм разьбіла ўсю гэную хітрую палітыку. А нашы паслы з соймавае трыбуны абвесьцілі ўсяму сьвету, што беларускі народ, жывы і здольны да самастойнага культурнага і палітычнага жыцьця, пратэстуе проці ўсіх старых крыўд і зьдзекаў над ім і жадае для сябе такіх правоў пад польскаю ўладаю, якія забясьпечаны яму польскай канстытуцыяй і міжнароднымі трактатамі. Нашы паслы заявілі польскаму грамадзянству, што беларусы не зракліся і ніколі не зракуцца свайго незалежніцкага ідэалу, — і словы гэныя абляцелі ўвесь сьвет, напамінаючы яму аб ягоным абавязку ў адносінах да самага пакрыўджанага сярод „залежных“ народаў.

І ў гэтым, ня гледзячы на немагчымасьць дайсьці некіх рэальных уступак ад польскага сойму, наша найвялікшая здабыча ў першым годзе беларускае парляманцкае працы на грунце польскага сойму. *Беларускае пытаньне пастаўлена*—пастаўлена ясна і цьвёрда. Толькі выразная злая воля можа адгэтуль прахадзіць міма яго. І ўрад генарала Сікорскага, каторы аказаўся такімжа шавіністычным, як усе яго папярэднікі, прымушаны быў з соймавае трыбуны прызнаць справядлівыя беларускія дамаганьні, хоць ні аднае мінуты ня думаў спаўняць сваіх абяцанак, — а цяперашні галава міністэрства, пан Вітос, паўтараў блізу ўсё тое, што суліў нам Сікорскі.

Праўда, ад слоў да дзела—вельмі далёка. Ні мы, ні наш народ ня ймем веры ў тое, каб Хіена-пястоўскі ўрад быў для нас лепшым за ўрады „пілсудчыкаў“. Ні мы, ні наш народ ня можа спадзявацца разьвязаньня беларускага пытаньня імпэрыялістычнай і шавіністычнай польскай буржуазіяй. Але тым больш павінны мы гуртаваць нашы духовыя і матэрыяльныя сілы, каб прыжджаць лепшых часоў і *не паддацца* ў пэрыяд ліхалецьця.

Лаўрыновіч.

Арганізуйце школьныя музэі.

Мэтаю зьбіраньня такога музэю зьяўляецца між іншым дапамога разьвіцьцю сілаў і здольнасьцяў дзяцей, пазнаньне мяйсцовай прыроды і набываньне школаю танных пасобіяў па ўсіх прадметах без усялякіх затратаў. Але ў школе ня так важны сам музэй, як працэс збіраньня яго, у якім дзеці практыкуюць сваю волю, завострываюць розум, гадуюць пачуцьці навучаюцца сьвядомым і ўдумлівым адносінам да акружаючаго, навучаюцца наглядаць, здабываюць сыстэматычныя назнаньні ня толькі з кніжкі, але на жывой практыцы.

Такім парадкам, музэй зьяўляецца мэтадам, асабліва важным у руках настаўніка.

Адгэтуль ясна, што музэй радзімазнаўства не павінен быць кунст-камарай. Туды павінны зьбірацца самыя звычайныя рэчы, важныя дзеля таго, што з імі часта прыходзіцца сустракацца толькі мы ня умеем іх бачыць, што школа павінна адбіваць акружаючае жыцьцё і распрацоўваць яго матар'ял. Усё надзвычайнае не для такога музэю, бо хоць на такое і можна падзівіцца, але ня можна вучыцца звычайнаму, штодзённаму—значыць жыцьцю.

Але, разумеецца, музэй радзімазнаўства не павінен быць вузкай спэцыяльнасьці: сельска-гаспадарчы ці іншы—ён навінен насіць агульна-адукацыйны характар, там павінна адбіцца і сёньнешняе і ўчарашняе жыцьцё.

Зьбіраць можна і праз выпадковыя знаходкі на экскурсіях з настаўнікам і сыстэматычнымі, арганізаванамі зборамі, калі вучань сьвядома шукае патрэбную рэч.

Але разам з тым, як музэй павінен адбіваць акружаючую прыроду і жыцьцё, ён павінен адбіваць і нутраное жыцьцё школы. Тут будуць і лепка, і малюнкі, і мадэлі, і журнал і г. д.

Дзеці прыродныя калекцыянеры і вось яны то і займуцца арганізацыяй музэяў. Трэба толькі іх накіраваць на гэта. Зьбіраць жа, разумеецца трэба ў працягу ўсяго школьнага часу: зімой, летам і г. д.

Памяшканьня ніякага пад музэй ня трэба—звычайныя паліцы на сьцяне, шафа—могуць здаволіць на першы час яго патрэбы.

Асабліва ўсе дашкольныя ўстановы павінны безадкладна ўзяцца за арганізацыю музэяў радзімазнаўства.

Музэі маюць вялікую вагу.

Беражыце прыроду! Арганізуйце музэі!

М. Касьпяровіч.

Карэспандэнцыі.

Беларускі спэктакль.

Беларуская Радашкоўская Гімназія ладзіла 17-га чэрвеня беларускі спэктакль, на якім пастаўлена было: „На папасе“ Янкі Купалы. Пьесу П. С. Х. Сучаснага Вялейскі стараста недазволіў да пастаноўкі. Асаблівай ігрой на сцэне выдзяліўся вучыцель Гаўрылік, які прагёў дужа добра дэклямацыю верша „Агароднік“, іграй на скрыпцы і прапяяў некалькі беларускіх песянь.

Гэты спэктакль, як і ўсе іншыя спэктаклі, прайшоў дужа ўдала і сабраў шмат публікі.

К—віч.

З Беларускага жыцьця

Беларусы ў Амэрыцы.

У Суботу, 9 чэрвена ў Чыкаго Беларускі Камітэт сабраньне беларусаў ураджэнцаў Горадненскай, Віленскай, Менскай, Магілёўскай, Вітэбскай і Смаленскай губэрняў. У парадку дня было: 1. Апошнія весткі з Беларусі, даклад Жукава. 2. Грамадзка-палітычныя задачы беларусаў у Амэрыцы—даклад Змагара. 3. Аб беларускім зьезьдзе ў Амэрыцы на 1-га верасьня—даклад Міхайлоўскага. 4. Прыймо новых сябраў у Камітэт. 5. Бягучыя справы. 6. Свабодная дыскусыя.

З Менску.

Пачтовыя аддзяленьні ў валасьцях.

Пры ўсіх валасных выканаўчых камітэтах Беларусі маецца ў бліжэйшым часе адчыненьне пачтовых аддзяленьняў.

Глебавае абсьледаваньне Беларусі.

Нар. Кам. Земляробства супольна з Інстытутам Сельскае Гаспадаркі арганізаваў навуцовую экспэдыцыю дзеля абсьледаваньня глебаў усіх паветаў Беларусі. На чале экспэдыцыі стаіць прафэсар Інстытуту Касаткін.

Вынікі гэтае навуковае працы пасьля апрацоўкі маюць быць перададзены ў Беларускі Аддзел Усерасейскай Сельска-Гаспадарчай Выстаўкі.

Праца гэтай экспедыцыі працягнецца да верасьня месяца.

М. В.

Усячына.

Чужая рана не баліць.

Газэта „Ekspress Wileński“ у № 69 нападае на тых, хто дазволіў «вандальна нішчыць лясы» ў Бэскідах і ліець неўсьцешна сьлёзы па тых лясах. А хай бы патрыоты з „Ekspressu Wileńskiego“ пагляздзелі, што робіцца на гэтых слаўных „крэсах усходніх“ з беларускімі лесамі Не кажучы ўжо аб паўсямесным нішчэньні лясоў по усей тэрыторыі беларускіх зямель, высякаецца рэдкі па пэўнасьці ў усей Эўропе лес, як Белавежская пушча. Тут ужо горш нават як „вандальное нішчэньне лясоў“.

Кнігі, прысланыя ў Рэдакцыю.

Нова культура. Журнал культурного, суспільного й політычнага життя. Чэрвень—ліпень 2 і 3 ч. Львів. Зьмест: Смерть націаналізму. *М. Тарноўскі:* Мы. Герої. *П. Філіповіч:* Я робітнік. Грізі залізо. *Атаманюк:* В нас міць, в нас сіла. *Л. Томашевскій:* Утомленым. *Бар.-Толомей:* На похілених площах. *Гр. Косінка:* Новелі дезертіра. *З. Зубрей:* Пролетарске мастецтво. *С. В.:* Ромен Ролян. *А. Головка:* Фільмы Революції. *П. Костенко:* Основы социялістичной теорії історічного розвітку. *Емпе:* Пролетарызацыя культуры. *Аос:* Фашізм. *А. Ревізорчук:* Новій інтернаціонал і його фізіономія. *А. Черецкій:* Украінскій дрібнобуржуный табор 1. Трудовікі, 2. Радікалы, 3. Хрістіянські суспільнікі і 4. Москвофілі. Містецко-літературна хроніка. Крытікі і бібліографія.

Сэкрэтарыяты Беларускага Пасольскага Клюбу.

1) **Вільня**, Віленская вул. 12 кв, 6.
2) **Ліда**, 11 Слабодка 8.
3) **м. Глыбокае**, Дзісьненскага павету, вул. Сенкевіча 46.
4) **Жодзішкі**, Сьвянцянскага пав. кс. Годлеўскі.
5) **Навгградак**, Вялікі Рынак 14.
6) **Нясьвіж**, Альбянская 28.
7) **Столбцы**. Шпітальная 22.
8) **Горадня**, Мастовая 9.
9) **Бельск**, Замковая вул. 3, кв. 19.
10) **м. Саколка**, Горадзенская вул. 34.
11) **м. Клешчэлі**, Бельск. павету.
12) **м. Крынкі**, Горадзенскага павету, Горадзенская вул. 34.
13) **Пружаны**. Вул. кс. Буткевіча, 16.

Беларускі Пасольскі Клюб, Варшава, Вейская вул. Сойм.

Выдавец М. Гронімаў. Стэфанская 15.

Друкарня А. Дворжэца Завальная, 32